# ПРАТАКОЛ
## аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыйнай і навуковай дзейнасці паміж федэральнай дзяржаўнай казённай адукацыйнай установай вышэйшай адукацыі «Краснадарскі ўніверсітэт Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай Федэрацыі» і ўстановай адукацыі «Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь»

Федэральная дзяржаўная казённая адукацыйная ўстанова вышэйшай адукацыі «Краснадарскі ўніверсітэт Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай Федэрацыі» і ўстанова адукацыі «Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь», якія ў далейшым называюцца Бакі,

на падставе Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам унутраных спраў Расійскай Федэрацыі і Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь ад 30 верасня 1997 года,

імкнучыся да развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і навукі,

у мэтах развіцця кантактаў паміж адукацыйнымі арганізацыямі, а таксама іх навуковымі, навукова-педагагічнымі калектывамі, курсантамі, слухачамі, ад'юнктамі,

прыйшлі да наступнага ўзаемаразумення.

1. Бакі выказваюць намер:

а) ажыццяўляць абмен:

вопытам у сферы адукацыі і навукі, прафесійнага адбору, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў у адукацыйных арганізацыях для службы ў паліцыі/міліцыі;

навукова-педагагічнымі групамі, курсантамі і слухачамі ў колькасці, складзе і ў тэрмін, узгодненыя Бакамі, дадаткова ў рамках сапраўднага Пратакола;

ад'юнктамі, якія працуюць над дысертацыямі на суісканне навуковых ступеняў;

навуковымі, вучэбнымі і метадычнымі выданнямі;

праграмамі выкладання вучэбных дысцыплін, рабочымі планамі і тэхналогіямі навучання;

б) праводзіць сумесныя навуковыя даследаванні па загадзя ўзгодненай тэматыцы, якая мае ўзаемную цікавасць;

в) выдаваць сумесныя навуковыя артыкулы, манаграфіі, вучэбныя і вучэбна-метадычныя дапаможнікі, зборнікі навуковых прац;

г) распрацоўваць навукова-тэхнічныя і метадычныя праекты;

в) ажыццяўляць узаемнае рэцэнзаванне вынікаў навуковых даследаванняў Бакоў;

е) развіваць і ўмацоўваць культурныя і спартыўныя сувязі.

2. Бакі будуць прадугледжваць магчымасць удзелу выкладчыкаў, курсантаў, слухачоў і ад'юнктаў у навуковых канферэнцыях, семінарах, круглых сталах, дыскусіях, арганізаваных любым з Бакоў, а таксама

прадастаўленне магчымасці публікацыі навуковых прац у навуковых выданнях Бакоў.

3. Бакі маюць намер ажыццяўляць падрыхтоўку мэтавых рабочых праграм, якія будуць адлюстроўваць канкрэтны механізм выканання гэтага Пратакола на кожны навучальны год.

4. Дадзены Пратакол не з’яўляецца міжнароднай дамовай, не закранае і не стварае для Бакоў якіх-небудзь правоў і абавязацельстваў, якія рэгулююцца міжнародным правам, у тым ліку фінансавых абавязацельстваў.

5. Па ўзаемнай пісьмова афармленай згодзе Бакоў у дадзены Пратакол могуць быць унесены змяненні і дапаўненні.

6. Дадзены Пратакол прымяняецца з даты падпісання і да сканчэння 30 дзён з даты атрымання адным Бокам пісьмовага паведамлення другога Боку аб намеры спыніць яго прымяненне.

Падпісана ў г. Магілёве «31» 10 2019 года ў двух экзэмплярах, на рускай і беларускай мовах кожны.

| | |
|---|---|
| Начальнік<br>генерал-лейтэнант паліцыі | Начальнік<br>генерал-маёр міліцыі |
| А.В. Сіманенка | В.М. Палішчук |